Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

12 СНЕЖНЯ 2024 г. ЧАЦВЕР № 242 (30376)

ВАЖНЫЯ НАВАЦЫІ КОДЭКСА АБ АДУКАЦЫІ 7



Сацыяльны клопат

# НОВЫ ГОД — У НОВАЙ КВАТЭРЫ

## У Мінскім раёне адкрылі новы арэндны дом

**У сераду ў аграгарадку Сеніца, што пад Мінскам, адбылася ўрачыстая цырымонія адкрыцця новага арэнднага дома. Навасёламі сталі работнікі ААТ «Гастэлаўскае». Яны атрымалі службовае жыллё, якое з часам змогуць набыць ва ўласнасць. Дзякуючы такому важнаму падарунку сваё жыллёвае пытанне змогуць вырашыць як ветэраны вытворчасці, так і маладыя спецыялісты.**





Новы дом на 122 кватэры быў пабудаваны пры падтрымцы Мінскага гарвыканкама, а таксама за кошт уласных сродкаў прадпрыемства. Павіншаваць навасёлаў з такой важнай падзеяй прыехалі **намеснік прэм'ер-міністра Юрый ШУЛЕЙКА, старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ, першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Васіль СЫСОЕЎ** і кіраўніцтва прадпрыемства.

СТАР. 2

**Аграном па насенняводстве Юлія ГАНЧАРОВА і яе муж, намеснік дырэктара па раслінаводстве Аляксандр ГАНЧАРОЎ працуюць у ААТ «Гастэлаўскае» два гады. Учора маладыя людзі сталі шчаслівымі жыхарамі новай трохпакаёвай кватэры арэнднага тыпу. У Аляксандра з Юліяй падрастаюць двое хлопчыкаў: 14-гадовы Максім і 8-гадовы Дзіма. У чаргу па паляпшэнні жыллёвых умоў сужэнцы сталі адразу ж пасля працаўладкавання ў гаспадарцы. «Нават не перадаць словамі тыя эмоцыі, якія мы адчуваем! Гэта сапраўдны навагодні цуд, найлепшы падарунак на Новы год!» — дзеляцца працаўнікі вёскі.**

Адпачынак

# Шлях да сэрца вандроўніка

## Ён, напэўна, ляжыць і праз страўнік

**Сёлета снежань — не толькі прадвеснік Новага года. Гэта яшчэ і месяц гастранамічнага турызму. У 2024-м кожны месяц быў прысвечаны аднаму з відаў турызму, якіх, паводле пераліку Міністэрства спорту і турызму, трынаццаць. І вось снежань, мітуслівы і перадсвяточны, вырашылі прысвяціць самай жыццярадаснай і сібарыцкай разнавіднасці вандровак.**

— На снежань створаны план мерапрыемстваў, які ахоплівае прэс-канферэнцыі, пасяджэнні, семінары, круглыя сталы, выставы, майстар-класы, выставы-дэгустацыі, акцыі, конкурсы, калядныя і навагоднія кірмашы. Гастранамічны патэнцыял Беларусі прадставяць на III Турыстычнай анлайн-выставе BELARUS.TRAVEL, якая пройдзе 17—20 снежня, — распавяла **кансультант аддзела планавання і арганізацыі турыстычнай дзейнасці Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Ангеліна МАЗУРКЕВІЧ**.

У 2025 годзе практыка па правядзенні штомесячных мерапрыемстваў па розных відах турызму будзе прадоўжана, дадала яна.

СТАР. 9



ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



## Задача ад Першага

> **«Наведваючы «Дажынкі», я шчыра радаваўся поспехам кожнай вобласці. Але пры гэтым уважліва вывучаў, што мы яшчэ можам зрабіць для людзей, як павысіць прывабнасць вёскі. Каб чалавек ведаў: жыць у сельскай мясцовасці добра, выгадна і перспектыўна.»**

*Аляксандр Лукашэнка на свяце ўшанавання працаўнікоў вёскі «Дажынкі» ў Клімавічах. 16 лістапада 2024 года*

# СТВАРЫЦЬ ПАЎНАВАРТАСНЫ САЦЫЯЛЬНЫ СТАНДАРТ

### Як замацаваць людзей на вёсцы?

**Беларусь — краіна для людзей. Менавіта таму ўсе рашэнні павінны прымацца ў інтарэсах народа. І адной з прыярытэтных задач урада было і застаецца забеспячэнне грамадзян жыллём. Уласны дах над галавой важны для любога чалавека, а асабліва для маладой сям'і. Гэта яе ўпэўненасць у заўтрашнім дні. Акрамя таго, у нашай краіне пастаянна ўдасканальваюцца падыходы да аказання дзяржаўнай падтрымкі пры паляпшэнні жыллёвых умоў, у першую чаргу ў сельскай мясцовасці.**

**Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Юрый ШУЛЕЙКА:**

— Кіраўнік дзяржавы заўсёды дакладна расстаўляе прыярытэты. Сёння трэба падтрымліваць сельскую гаспадарку з розных крыніц. Горад Мінск фарміруе асаблівы бюджэт, які сапраўды можа аказаць істотную падтрымку ў той жа Мінскай вобласці і іншым рэгіёнам, якія пазначыў Прэзідэнт. Мы сёння будзем дадаткова працаваць у Віцебскай, Магілёўскай і Гомельскай абласцях. Самыя высокія фінансавыя патокі і даходнасць у сталіцы, што дазваляе аграрыям вырашаць свае пытанні, таму што харчовая бяспека, сельская гаспадарка ў многіх частках датуюцца, іх трэба падтрымліваць. І вось, выкарыстоўваючы грошы Мінгарвыканкама, ужо тры гады рухаецца гэтая праграма.

Мінск сёння — гэта горад спажывання. Харчовую бяспеку ў нашай краіне ніхто не адмяняў. Гэта ў тым ліку і стабілізацыйныя фонды, гэта і паліца ў краме, на якой мінчане хочуць бачыць дзесяць сартоў малака, смятаны, масла і розныя прадукты мяснога паходжання. Таму ўзаемасувязь горада, насельніцтва, грошай і палітыкі нашай дзяржавы, падтрымка сельскай гаспадаркі асабліва важныя сёння. Як адзін з варыянтаў такога ўзаемадзеяння — сумесныя фінансы прадпрыемства «Гастэлаўскае» і Мінскага гарвыканкама дазволілі пабудаваць арэндны дом на 122 сям'і, дзе фактычна за сярэдні заробак горада Мінска будуць працаваць на вёсцы выдатныя спецыялісты з правам далейшага выкупу жылля, калі яны зацвердзяцца і адчуюць, што сяло ім па душы.

Трэба разумець, што сельскага насельніцтва, на жаль, становіцца менш. Таму сёння аграгарадок з'яўляецца адным з тых механізмаў, якія трэба развіваць, працаваць над тым, каб пакінуць там працаздольнае насельніцтва, у першую чаргу — моладзь. Для гэтага неабходна, каб у аграгарадку быў паўнавартасны сацыяльны стандарт. Тут павінен быць дзіцячы сад, ФАП, Дом культуры або Дом побыту, дзе або пасля работы, або ў выхадны дзень работнікі сельскай гаспадаркі ці іншых прадпрыемстваў маглі б паўнавартасна атрымліваць неабходныя паслугі, той соцыум, які сёння патрэбен літаральна кожны дзень. На вёсцы павінна быць і амбулаторыя, у якой можна здаць аналізы, а пры неабходнасці — паехаць у райцэнтр. А для гэтага патрэбны транспартныя зносіны з горадам: маршрутныя і аўтобусныя. Калі побач праходзіць чыгунка, павінна быць і электрычка. Менавіта тады каля гэтага аграгарадка фарміруецца сур'ёзны кластар сельгасвытворчасці, таму што ў аснове любой важнай справы стаяць людзі.

**Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# НОВЫ ГОД — У НОВАЙ КВАТЭРЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

«Месца цудоўнае, дом шыкоўны, побач школа, крамы таксама маюцца — у аграгарадку ёсць усё для таго, каб паўнавартасна жыць і працаваць у сельскай гаспадарцы, — ацаніў выгоды для навасёлаў Юрый Шулейка. — Гэта ініцыятыва горада, і такі комплексны падыход кіраўніцтва сталіцы — адна з агульных тэндэнцый, пра якія якраз і кажа кіраўнік дзяржавы, заклікаючы горад дапамагаць вёсцы. Зусім нядаўна гарвыканкам для Мінскай вобласці аказаў сур'ёзную шэфскую дапамогу — пабудаваў некалькі жывёлагадоўчых комплексаў па вытворчасці малака. Гэтая традыцыя будзе працягвацца і далей».

Старшыня Мінскага гарвыканкама Уладзімір Кухараў адзначыў, што, нягледзячы на складаныя ўмовы надвор'я, супрацоўнікі ААТ «Гастэлаўскае» робяць многае, каб гаспадарка заставалася на высокім узроўні, і падзякаваў кіраўніцтву гаспадаркі за ініцыятыву пабудаваць гэты дом. «Мы выдатна разумеем: для таго, каб добра працаваць тут, на зямлі, патрэбны добрыя жыллёвыя ўмовы,» — сказаў кіраўнік горада. Дарэчы, дапамагалі тут і Мінскі аблвыканкам, і райвыканкам — у выбары і будаўніцтве неабходнай інфраструктуры.

**Аграном «Гастэлаўскага» па насенніцтве Юлія ГАНЧАРОВА** ад імя навасёлаў выказала шчырую падзяку Прэзідэнту, кіраўніцтву горада і прадпрыемства, а таксама ўсім службам, якія ўзялі ўдзел у будаўніцтве гэтага дома: «Дзякуючы вам у нас ёсць магчымасць замацавацца, жыць і працаваць на зямлі, працаваць на карысць нашай квітнеючай Беларусі. Дзякуючы вам сем'і заселяцца ў свае новыя ўтульныя кватэры. Мы, работнікі гаспадаркі, абяцаем, што прыкладзём усе сілы, веды, уменні і ста올анні, каб наша прадпрыемства было найлепшым у краіне! Тут цэняць і любяць людзей, і гэты дом — сімвал гэтага прагрэсу, росту і імкнення да лепшага жыцця кожнага з нас».

Прадпрыемства «Гастэлаўскае» брэндавае. Яно — лідар у вытворчасці сельскагаспадарчай прадукцыі, і па надоі малака, і па ўраджайнасці. Аб гэтым расказаў першы намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Васіль Сысоеў: «Гэтую планку гаспадарка трымае з года ў год. Радуе і тое, што ў такіх прадпрыемствах думаюць пра будучыню. Людзі, якія будуць жыць у новым сучасным доме і працаваць у сельскай гаспадарцы, атрымліваюць дадатковы стымул для таго, каб яшчэ больш аддавацца вытворчасці. Мы бачылі камфортнае жыллё, дзе зроблена ўсё. Дом знаходзіцца ў крокавай даступнасці ад школы, гэта значыць дзеці цалкам будуць знаходзіцца пад наглядам. Тут усё склалася для таго, каб чалавек думаў толькі пра тое, каб на вытворчасці быў парадак, каб было атрыманне больш высокіх вынікаў, каб гэта прадпрыемства займала яшчэ вышэйшае становішча па вобласці і па краіне».

Першы намеснік старшыні адзначыў, што сёння ставіцца задача браць прыклад з такіх перадавых прадпрыемстваў. Акрамя таго, у Мінскай вобласці многае робіцца ў частцы галіны жывёлагадоўлі: «Летась мы здавалі больш як 30 новых малочнатаварных комплексаў. Планку практычна не знізілі, не менш за 20 будзе здадзена ў гэтым годзе. Комплексы, якія пабудаваны летась, сёння даюць нам аддачу, і мы атрымліваем там малако. У гэтай гаспадарцы ўсё ёсць для таго, каб стварыць умовы не толькі дома, але і на рабоце, а гэта адыгрывае немалаважную ролю».

Усяго ў доме 122 кватэры. Работнікам «Гастэлаўскага» дадуць 107 з іх, дзевяць кватэр — для шматдзетных сем'яў, шэсць кватэр прызначаны для работнікаў сацыяльнай сферы, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і працуюць на тэрыторыі аграгарадка.

**Даніiл ХМЯЛЬНІЦКІ.**
**Фота Лізаветы ГОЛАД.**



**Механізатар Сяргей ЛАРЫЁНАЎ з Чэрвеньскага раёна працуе ў ААТ «Гастэлаўскае» два гады, яго жонка Наталля — выхавальнік у дзіцячым садзе. Разам маладыя людзі выхоўваюць траіх дзяцей: Цімафея, Паліну і Ксенію. Учора яны сталі ўладальнікамі ключоў ад новай трохпакаёвай кватэры.**

### У тэму

На Гомельшчыне больш за 180 дашкалят і малодшых школьнікаў адначасова змогуць аздараўляцца ў абноўленым рэабілітацыйна-аздараўленчым цэнтры «Крыштальны». Адзіная ў сваім родзе ў рэгіёне ўстанова пачала працаваць пасля рэканструкцыі ў абласным цэнтры. Аднаўленчыя работы фінансаваліся за кошт дзяржпраграмы па пераадоленні наступстваў катастрофы на ЧАЭС.

Плошча цэнтра павялічылася ў паўтара раза: узведзены новы шматфункцыянальны корпус, праведзена рэканструкцыя існуючага будынка, абноўлены харчаблок, сталовая, лабараторыі, адміністрацыйны блок, абсталяваны прапускны пункт.

— Мы працуем на будучыню, а самыя важныя для нас укладанні, самыя эфектыўныя інвестыцыі — нашы дзеці, іх здароўе, развіццё, адукацыя, камфорт, — падкрэсліў падчас урачыстага адкрыцця цэнтра **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.**

## Добрая навіна

# ПРЫБАЎКА Ў КІШЭНІ

### З 1 студзеня 2025 года мінімальная заработная плата ўстаноўлена ў памеры 726 рублёў

**Адпаведную пастанову падпісаў прэм'ер-міністр Раман Галоўчанка, паведамілі ў прэс-службе ўрада.**

Нагадаем, што ўстаноўлены 1 студзеня 2024 года памер мінімальнай заработнай платы складае 626 рублёў.

— У параўнанні са студзенем 2024 года мінімальная заработная плата павялічана на 100 рублёў, або амаль на 16 працэнтаў, — пракаментавалі змены ў Міністэрстве працы і сацыяльнай абароны.

У ведамстве дадалі, што мінімальную заработную плату наймальнік абавязаны выкарыстоўваць у якасці ніжняй мяжы аплаты працы работнікаў.

— Дадзены сацыяльны стандарт прымяняецца ў арганізацыях незалежна ад формы ўласнасці або віду эканамічнай дзейнасці, у тым ліку ў таварыствах уласнікаў, у індывідуальных прадпрымальнікаў, у дачыненні да работнікаў, якія заключылі працоўныя дагаворы, — патлумачылі ў Мінпрацы. — Мінімальная заработная плата гарантуецца ўсім работнікам пры выкананні вызначаных імі абавязкаў і прымяняецца з улікам адпрацаванага часу.

Акрамя таго, у ведамстве звярнулі ўвагу на тое, што калектыўным дагаворам (пагадненнем) можа быць устаноўлены больш высокі памер месячнай мінімальнай заработнай платы.

### Дарэчы

#### Першыя ў «пяцёрцы»

У Беларусі зафіксаваны самы высокі рост рэальнай заработнай платы сярод краін Еўразійскага эканамічнага саюза (ЕАЭС) па выніках студзеня — верасня бягучага года. Пра гэта БелТА паведамілі ў прэс-службе Еўразійскай эканамічнай камісіі (ЕЭК).

— За дзевяць месяцаў 2024 года ва ўсіх краінах ЕАЭС вырасла зарплата ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Самыя высокія тэмпы росту сярэднямесячнай рэальнай заработнай платы зафіксаваны ў Беларусі (113 %) і Расіі (109 %) , — адзначылі ў ЕЭК. — У Кыргызстане рэальная зарплата вырасла на 6,7 %, у Арменіі — на 6,6 %, у Казахстане — на 2,9 %.

Найбольшы рост наміналнай зарплаты за гэты перыяд зафіксаваны таксама ў Беларусі — на 19,6 %. У Расіі яна вырасла на 18 %, у Казахстане і Кыргызстане — на 11,8 %, у Арменіі — на 6,6 %.

Зваротная сувязь

# Прапануйце — і вас пачуюць

## Ініцыятывы па ключавых пытаннях развіцця краіны чакаюць на анлайн-платформе «Народная пятилетка»

**З канца кастрычніка ў Беларусі працуе новая анлайн-платформа «Народная пятилетка», дзе кожны ахвотны жыхар краіны можа пакінуць сваё меркаванні, ідэі і прапановы па ключавых сферах развіцця дзяржавы: ад пытанняў ЖКГ адукацыі і аховы здароўя да змянення заканадаўства.**

За гэты час платформу наведалі каля 4800 грамадзян, якія пакінулі каля 1800 унікальных прапаноў. Па выніках некаторых з іх падрыхтаваны шэраг дакументаў, якія накіраваны зацікаўленым — у органы выканаўчай і заканадаўчай улады. А найбольш сталыя і прадуманыя прапановы знойдуць сваё адлюстраванне ў Праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны на 2025—2030 гады.

Як распавёў **намеснік старшыні Беларускай партыі «Белая Русь», намеснік старшыні РГА «Белая Русь» Андрэй БАСАК**, найбольш ідэй, прапаноў і меркаванняў жыхары нашай краіны пакідаюць па такіх сферах, як ЖКГ, ахова здароўя, адукацыя і жыццё ў вёсцы.

**— Мы бачым, што грамадзянская супольнасць сёння праходзіць сваё развіццё і займае пэўную нішу ў дзяржаве. Адна з галоўных функцый платформы — прыцягнуць нашых грамадзян у кіраванне дзяржавай. Ідэі, якімі яны дзеляцца, у будучыні могуць быць увасоблены ў жыццё, што зробіць яго больш камфортным, а таксама павысіць якасць паслуг у розных сферах, — адзначыў Андрэй Басак.**

**Каб падзяліцца сваім меркаваннем, ідэяй ці прапановай, неабходна зайсці на рэсурс меркаванне.бел, перайсці на анлайн-платформу «Народная пятилетка», выканаць простае арыфметычнае дзеянне для пацвярджэння таго, што карыстальнік з'яўляецца чалавекам, пасля чаго абраць сферу, якая цікавіць, і падзяліцца ў вольнай форме сваім меркаваннем. Платформа з'яўляецца ананімнай. Меркаванне ў далейшым будзе прааналізавана і ўлічана.**

І такіх прыкладаў ужо нямала. Мінчане і госці сталіцы шмат пакідаюць прапаноў па добраўпарадкаванні паркаў, вуліц і іншых тэрыторый, рабоце грамадскага транспарту, маршрутах і інтэрвалах руху. Усе гэтыя прапановы накіраваны кіраўніцтву Мінгарвыканкама. Не адстаюць і сельскія жыхары — шэраг ініцыятыў датычыцца паляпшэння жыцця на вёсцы і вяртання людзей у сельскую мясцовасць. Нямала слушных ініцыятыў на платформе па змяненні заканадаўства, у прыватнасці якое датычыцца сямейных адносін, правілаў дарожнага руху і інш. Яны накіроўваюцца ў Палату прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, міністэрствы і іншым зацікаўленым.

У некаторыя дні адзначаюцца пікавыя значэнні, калі ад грамадзян паступае больш за 100 прапаноў, што з'яўляецца сведчаннем запатрабаванасці платформы. Як адзначыў **сацыёлаг-кансультант Уладзімір ЛІТВІНОВІЧ**, анлайн-платформа «Народная пятилетка» — перадавы інструмент у плане ўліку меркавання грамадзян для прыняцця кіраўніцкіх рашэнняў і вырашэння важных для грамадзян пытанняў. Такая практыка існуе на постсавецкай прасторы. Напрыклад, ва Узбекістане ёсць платформа, на якой збіраюцца думкі грамадзян, пасля чаго выбудоўваецца іх рэйтынг. Людзі маюць магчымасць выказацца, якія з абазначаных пытанняў з'яўляюцца больш актуальнымі, і далей у парадку прыярытэту гэтыя пытанні накіроўваюцца ў розныя органы, якія адказваюць за тыя ці іншыя сферы, узнятыя ў зваротах людзей. Некалькі падобных платформ існуе і ў Расіі. Усе яны ўлічваюць меркаванне актыўных, неабыякавых грамадзян, якія гатовы выказваць свае думкі, канкрэтныя прапановы па ўдасканаленні тых ці іншых працэсаў.

Нямала прапаноў на анлайн-платформе і ад моладзі. Найбольш турбуюць тэмы адукацыі, прафесійнага росту і падрыхтоўкі на розных этапах навучання, статусу і сацыяльных гарантый маладога спецыяліста, магчымасцяў для атрымання жылля. Паступаюць прапановы ад моладзі аб развіцці малых гарадоў, рэканструкцыі ўстаноў культуры і будаўніцтве спартыўных аб'ектаў.

**— Звароты маюць канструктыўны характар. Гэта вельмі важна, бо паказвае, што моладзь сёння гатова гаварыць, уносіць прапановы і ўвасабляць іх у жыццё, — заўважыў другі сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандр Іваненка.**

**Алена КРАВЕЦ.**

### Апытанне анлайн-платформы «НАРОДНАЯ ПЯТИЛЕТКА»: ініцыятывы па развіцці ключавых сфер грамадскага жыцця




На 10.12.24 АНЛАЙН-ПЛАТФОРМА «НАРОДНАЯ ПЯТИЛЕТКА» мае завершаных адказаў 1814 ад 4736 удзельнікаў. На дыяграме выяўлены толькі завершаныя і карэктныя адказы.

©Інфаграфіка БЕЛТА

26 студзеня 2025 ВЫБАРЫ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# Спакойна і ў адпаведнасці з заканадаўствам

## Цэнтрвыбаркам прыняў дакументы аб рэгістрацыі Алега Гайдукевіча і Аляксандра Хіжняка кандыдатамі ў Прэзідэнты

**Днём раней аналагічныя дакументы ў Цэнтральную выбарчую камісію падаў першы сакратар Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі Сяргей Сыранкоў. Дакументы, неабходныя для рэгістрацыі кандыдатам у Прэзідэнты, падаюцца ў ЦВК з 7 да 21 снежня ўключна. Дакументы могуць падаць як самі патэнцыяльныя кандыдаты ў Прэзідэнты, так і іх прадстаўнікі па даверанасці.**

Асоба, вылучаная кандыдатам у Прэзідэнты, прадстаўляе ў Цэнтральную камісію пісьмовую заяву аб згодзе балатавацца; біяграфічныя звесткі па форме, устаноўленай ЦВК; даведкі або копіі дакументаў, якія пацвярджаюць звесткі аб адукацыі, аб месцы працы і займаемай пасадзе служачага; дэкларацыі аб сваіх даходах і маёмасці, а таксама аб даходах і маёмасці жонкі (мужа) і паўналетніх блізкіх сваякоў, якія сумесна пражываюць і вядуць агульную гаспадарку.

### «ЗБОР ПОДПІСАЎ — МАГЧЫМАСЦЬ ПАЧУЦЬ ЛЮДЗЕЙ»

**Старшыня Рэспубліканскай партыі працы і справядлівасці Аляксандр ХІЖНЯК** звярнуў увагу на тое, што выбарчая кампанія праходзіць годна, спакойна, без эксцэсаў і інсінуацый. «Што датычыцца збору подпісаў, гэта таксама магчымасць пачуць меркаванні выбаршчыкаў, — адзначыў лідар партыі. — Людзі падыходзілі, задавалі шматлікага роду пытанні». Па яго словах, разам з традыцыйнымі пытаннямі, якія датычацца работы сістэмы жыллёва-камунальнай гаспадаркі, насельніцтва хвалюе кошт лекаў, даступнасць якаснай медыцынскай дапамогі ў сельскай мясцовасці.

Патэнцыяльны кандыдат у Прэзідэнты звярнуў увагу на высокі ўзровень палітычнай культуры грамадзян. «Інфармацыі ад Цэнтральнай выбарчай камісіі, ад СМІ цалкам дастаткова, каб кожны грамадзянін зрабіў свой выбар», — канстатаваў ён.

### «НЕ ДАЗВОЛІМ ВЫРАШАЦЬ ЛЁС КРАІНЫ НА ВУЛІЦАХ»

Як нагадаў у размове з журналістамі **старшыня Ліберальна-дэмакратычнай партыі Беларусі Алег ГАЙДУКЕВІЧ**, у 2020 годзе, на этапе збору подпісаў, спрабавалі збіваць супрацоўнікаў міліцыі, былі спробы масавых беспарадкаў. «Сёння ў нас зусім іншая выбарчая кампанія, — канстатаваў ён. — І ў нас можна павучыцца».

У якасці прыкладу абсалютна супрацьлеглай сітуацыі лідар партыі прывёў шэраг краін. «Малдова — пляваць на меркаванні выбаршчыкаў: ЕС падабаецца кандыдат — усё, ён пераможа, ніякіх парушэнняў няма, — канкрэтызаваў Алег Гайдукевіч. — Грузія: народ нічто не пытае, народ не супраць тых выбараў, яны прагаласавалі за кіруючую партыю. Камусьці не падабаецца — атрымайце масавыя беспарадкі. Сірыя — страшна глядзець. Якая дэмакратыя? Людзей забіваюць, і хтосьці ўсё роўна кажа: «Гэта перамога дэмакратыі».

Пры гэтым старшыня ЛДПБ прывёў у прыклад выбарчую кампанію ў Беларусі. «Кандыдаты не абражаюць адзін аднаго, — канкрэтызаваў ён. — Хто перашкаджае збіраць подпісы?»

Алег Гайдукевіч выказаў удзячнасць Цэнтрвыбаркаму за стварэння ўмовы. «Партыя адпрацавала, мы сабралі амаль у два разы больш неабходнай колькасці подпісаў», — заявіў ён.

Лідар партыі звярнуў увагу на тое, што самае дрэннае для краіны — адсутнасць дыскусіі, калі лёс краіны вырашаюць на вуліцы або не народ, а знешнія гульцы. «Сённяшнія выбары спакойныя, — падкрэсліў ён. — Не таму, што няма розных меркаванняў, няма розных партый, розных пунктаў гледжання і розных поглядаў. Проста мы праводзім выбары без знешніх гульцоў, забяспечваем электаральны суверэнітэт і, самае галоўнае, не дазволім вырашаць лёс краіны на вуліцах».

* * *

На цяперашнім этапе выбарчай кампаніі ідзе праверка дакладнасці подпісаў выбаршчыкаў у падпісных лістах, здадзеных каардынатарамі ініцыятыўных груп. Рэгістрацыя кандыдатаў у Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь пройдзе з 22 да 31 снежня 2024 года ўключна. З 1 да 25 студзеня 2025 года — перыяд перадвыбарнай агітацыі. Выбары Прэзідэнта Беларусі, нагадаем, прызначаны на 26 студзеня 2025 года.

**Вераніка КАНЮТА.**

Глабальны кантэкст

# ПАЛІТЫКІ І ПАЛІТЫКАНЫ: ПАСЛЯСЛОЎЕ КОВІДУ

**Даслоўна**

***«Калі б беларускія машынабудаўнічыя прадпрыемствы спынілі сваю работу на перыяд пандэміі, на рынках іх замясцілі б замежныя канкурэнты. Каб зноў стаць на ногі і раскруціцца, спатрэбіліся б сотні мільёнаў долараў. Я гэта ўсёк, што гэта камусьці трэба. І я ўсім заўсёды казаў, што гэта «шызафрэнія» (паніка пры COVID-19. — «Зв.»). Я ўжо жартаваць пачаў: для таго, каб вылечыцца (да сялян ехаў — яны ж усе працавалі), трэба трактар і сто грамаў... Выстаялі. Сёння ўжо амерыканцы, якія тралілі мяне ўвесь час, прызналі. Яны паўтарылі праз некаторы час усё тое, што я казаў.»***

*Прэзідэнт Беларусі*
*Аляксандр Лукашэнка*
*на сустрэчы з калектывам прадпрыемства «Пожснаб».*
10 снежня 2024 г.

**3 снежня 2024 года свет убачыў 520-старонкавы даклад аднаго з падкамітэтаў Палаты прадстаўнікоў Кангрэса ЗША па выніках двухгадовага расследавання прычын узнікнення пандэміі COVID-19 і ацэнак дзейнасці дзяржаўных структур у гэты перыяд. Дакумент, які нарабіў шмат шуму ў сусветнай інфармацыйнай прасторы, не з'яўляецца якім-небудзь «боскім адкрыццём», аднак ён у поўнай меры пацвярджае праўду і празорлівасць беларускага лідара Аляксандра Лукашэнкі, які без пафасу і помпы правёў краіну праз гэты найскладанейшы гістарычны перыяд. У 2020—2022 гадах хто толькі не «кідаў камяні» ў адрас нашага Прэзідэнта і не вінаваціў яго ў некампетэнтнасці. Разам з тым Аляксандр Лукашэнка без сарамлівасці выказваў уласную пазіцыю і паступальна ратаваў беларускае грамадства. Мінулі гады. Выйшаў амерыканскі аналітычны даклад, а яго палажэнні ў поўнай меры пацвердзілі слушнасць меркавання нашага лідара.**

## Асноўныя палажэнні даклада кангрэсменаў

Не ўдаючыся ў падрабязнасці вялікага дакумента, спынімся толькі на яго асноўных палажэннях. Першая высновa перакрэслівае саму парадыгму, закладзеную ў сістэму мер барацьбы з распаўсюджваннем каранавіруса, прапанаваную Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя (СААЗ). Канстатуецца, што патрабаванне захоўваць сацыяльную дыстанцыю на адлегласці двух метраў не абгрунтаванае і не было падмацавана навуковымі даследаваннямі, эфектыўнасць абавязковага нашэння масак таксама не даказана і не знайшла практычнага пацвярджэння.

Другая высновa не менш глабальная — працяглыя лакдаўны нанеслі шкоду эканоміцы, псіхічнаму і фізічнаму здароўю насельніцтва. Мільёны людзей былі вымушаны адмовіцца ад звыклага ладу жыцця, у той час як патрабавалася адрасная абарона найбольш уразлівых пластоў насельніцтва.

Па тэксце дакумента адзначаецца, што «падчас пандэміі каранавіруса было закрыта 160 тыс. прадпрыемстваў, з якіх 60 % не адкрылася зноў. Гэта разарвала ланцужкі паставак і прывяло да самага высокага беспрацоўя ў ЗША з часоў Вялікай дэпрэсіі 1929 года. Дзеянні Федэральнай рэзервовай сістэмы дапамаглі пазбегнуць сур'ёзнага эканамічнага спаду, але прывялі да росту інфляцыі».

Закрыццё школ не з'яўлялася абгрунтаванай мерай барацьбы з каранавірусам, паколькі дзеці не былі яго распаўсюджвальнікамі і не хварэлі ў цяжкай форме. Закрыццё школ прывяло да адукацыйнага прабелу сярод школьнікаў, высокіх паказчыкаў стрэсу і зніжэння фізічнай формы. Адкрыццё адукацыйных устаноў адбылося пазней, чым было неабходна.

Праграма матэрыяльнай дапамогі насельніцтву прывяла да страты $64 млрд з-за карупцыйных схем. Яшчэ $191 млрд выкралі зламыснікі, выкарыстоўваючы падробленыя заявы на дапамогу па беспрацоўі. Сама меней палова сродкаў падаткаплацельшчыкаў была выкрадзена замежнымі ашуканцамі».

І як вам падобныя адкрыцці?

## Хто вінаваты і што рабіць?

У цэлым жа па тэксце дакумента робіцца высновa, што: «урад ЗША не справіўся з размеркаваннем сродкаў падчас пандэміі, дапусціўшы неабгрунтаваныя растраты, выпадкі махлярства і злоўжыванняў». Па вялікім рахунку, адносна Вашынгтона гэта і ўсё. А далей значна весялей.

У апублікаваным дакладзе кангрэсмены ЗША заяўляюць, што «каранавірус з найбольшай верагоднасцю мае лабараторнае паходжанне і распаўсюдзіўся ў выніку ўцечкі з лабараторыі ў кітайскім горадзе Ухань». Верагодна, менавіта гэта з'яўляецца галоўнай «разыначкай» 520-старонкавых пошукаў, якая дазваляе новаму прэзідэнту ЗША Д. Трампу «абгрунтавана» выказваць прэтэнзіі Кітаю і весці «непрымірымую» вайну з яго «экспансіяй». Гэта варта таго, каб пасыпаць уласную галаву попелам, часткова прызнаць памылкі, выносячы на ўсеагульны агляд праўду аб ковідзе і поўнай некампетэнтнасці СААЗ.

Амерыканскія кангрэсмены сказалі свае «аўтарытэтнае» слова, пры гэтым за дужкамі засталіся меркаванні вірусолагаў сусветнага ўзроўню.

Яшчэ 30 сакавіка 2021 года СААЗ апублікавала выніковы даклад міжнароднай групы, згодна з якім яна не змагла дакладна ўстанавіць крыніцу каранавіруса. Найбольш верагоднай версіяй была названа перадача каранавіруса ад жывёлы да іншай жывёлы, а затым да чалавека, у той час як версія ўцечкі з лабараторыі ва Ухані была названа «вельмі малаверагоднай».




Пры гэтым прафесар Калумбійскага ўніверсітэта Джэфры Сакс, які ўзначальваў работу камісіі па каранавірусе, сцвярджаў, што зыходны штам COVID-19 з'явіўся, хутчэй за ўсё, выпадкова «з біятэхналагічнай лабараторыі ЗША».

Тым не менш амерыканскія кангрэсмены, якія не маюць фундаментальных ведаў у галіне вірусалогіі, узялі на сябе смеласць абвінавачваць Кітай. Бо інфармацыйная вайна — гэта частка захавання аднапалярнага свету, а пройгрыш у ёй — страта ўласнага дамінавання і перавагі. У гэтых умовах фэйк, які прасоўваецца на дзяржаўным узроўні, істотна больш значны, чым любыя навуковыя даклады.

## Беларускі шлях і пандэмія

Ужо даўно забыты «страшылкі» ковіднага перыяду і далёка ў мінулым паток бруду, выплюхнуты на Прэзідэнта Беларусі «дэмакратычным» Захадам і не толькі. Не сумняваюся, што ўсе гэтыя персанажы не знойдуць у сабе сіл для таго, каб проста папрасіць прабачэння, аднак лічу мэтазгодным нагадаць некаторыя выказванні і рашэнні нашага лідара таго часу.

«Параю не «парыцца». Я ўжо даўно вам казаў, з самага першага разу: наша хвароба тут, у галаве. Як толькі вы пачынаеце вохкаць, ахкаць і бегаць чорт ведае куды — гэта бяда. Маладым людзям і перажываць няма чаго», — казаў Аляксандр Лукашэнка. «Я хачу ўсім гэтым жулікам міжнародным сказаць: хопіць ужо. Ужо нам вывернулі кішэні настолькі, што там нічога не засталося. Ужо распранулі ўсіх. Трэба заканчваць гэту пандэмію. Хопіць ужо, паздзекаваліся з людзей».

Беларусь — адзіная з краін не закрывала граніцы і не перакрывала транзіт, не спыняла прадпрыемствы і не знішчала ўласную эканоміку, не ўводзіла жорсткі каранцін і не закрывала грамадскія ўстановы (уключаючы школы), не аб'яўляла лакдаўны і займалася сельскай гаспадаркай. Адначасова лячылі людзей, сістэма аховы здароўя працавала ва ўзмоцненым рэжыме, а дзяржава падтрымлівала найбольш уразлівыя групы грамадзян. Больш за 2 млрд долараў было дадаткова накіравана на медыцыну і падтрымку ўрачоў.

У пачатку 2023 года Прэзідэнт канстатаваў: «На Беларусь ціснуць, у тым ліку за яе асаблівы шлях у пераадоленні пандэміі. Увесь свет ідзе беларускім шляхам у барацьбе з COVID-19, і яны не могуць нам дараваць, што сёння самі вымушаны гэты шлях паўтараць. Гэта адна з прычын ціску на нас. Наша рэагаванне на пандэмію COVID-19 выразна паказвае, што мы можам не толькі з гонарам выходзіць са складанасцяў, але і задаваць новы тон пераадолення глабальных крызісаў. Каранапсіхоз літаральна разарваў на лапікі Еўропу. Краіны замест таго, каб аб'яднаць намаганні, дзейнічалі спантанна, хаатычна, спрабавалі выстаяць і выратавацца паасобку».

Што з гэтага не адпавядае рэчаіснасці? Мы ўсе былі таму сведкамі, а карціна разгортвалася на нашых вачах.

Далей болей. «Каранавірус стаў з'явай кіраванай, у яго з'явіліся свае бенефіцыяры». І гэта непрыемная праўда, якая стала рэальнасцю. Па даных Давоскага форуму, найбольшы прыбытак атрымалі ўласнікі вытворчасцяў IT-індустрыі і фармакалогіі. Цяпер гэта звязаныя бізнесы. «Інакш кажучы, загналі ўсіх па дамах, далі гаджэты, падмянілі рэальнасць метасусветам і шпігуюць лекамі. Няўжо гэта мафія адмовіцца ад трыльёнаў свайго прыбытку? Таму і далей нагнятае паніку, а вакцыны становяцца элементам вялікай палітыкі. Разгарнуліся сапраўдныя вакцынныя войны. «Спадарожнік V» не прызнаюць, да «Сінафарма» ставяцца насцярожана, адначасова навязваюць уласны прадукт — «Пфайзер», — канстатаваў беларускі лідар.

Усё гэта практычна ў прамой пастаноўцы пацвярджаюць даныя даклада амерыканскага Кангрэса. Праўда дайшла да людзей, толькі з істотнай затрымкай і з неабходнай для Вашынгтона інтэрпрэтацыяй. Але ад гэтага яна не перастала быць праўдай і чарговы раз сведчыць аб празорлівасці беларускага Прэзідэнта, які ў самы складаны час узяў на сябе смеласць пайсці насуперак абставінам і, не задумваючыся аб палітычнай кан'юнктуры, стаў на абарону беларускага народа.

## Пасляслоўе

Захворванне, якое атрымала назву COVID-19 і выклікана каранавірусам SARS-CoV-2, справакавала сусветную пандэмію. Агулам заразілася звыш 620 млн чалавек, 6,5 мільёна з іх выратаваць не ўдалося. Вынікам пандэміі стаў глабальны крызіс 2020 года, выкліканы дзеяннямі ўрадаў большасці краін свету. Паводле даных Сусветнага банка, сусветны ВУП знізіўся на 3,2 %, што ў 2,5 раза больш, чым у 2009-м, пасля глабальнага фінансавага крызісу (1,3 %). Да гэтага часу ў розных кутках свету ідуць судовыя працэсы супраць службовых асоб (палітыканаў), якія нажываліся на горы ўласных грамадзян і «асвойвалі» ковідныя бюджэты з выгадай для сябе. У эпіцэнтры скандалу — кіраўнік ЕС Урсула фон дэр Ляен, якая заключыла кантракт з Пфайзергейт (Pfizergate), агульная сума якога дасягала 35 млрд еўра, а набытыя 1,8 млрд доз значна перавышалі патрэбы жыхароў Еўрасаюза.

У перыяд пандэміі менавіта наш Прэзідэнт наведваў чырвоныя зоны, падтрымліваў пацыентаў, гутарыў з урачамі і прымаў апаратыўныя меры па рэагаванні на абстаноўку, задзейнічаючы ўвесь дзяржаўны патэнцыял. Ён пераканаяннем і прымусам ратаваў беларускіх грамадзян, не лічачыся ні з уласным здароўем, ні з палітычным іміджам, які так цэняць палітыканы. Жыць для людзей стала не толькі яго палітычным прынцыпам, але і рэальным жыццёвым правілам.

Паводле ацэнак МВФ, агульныя страты ад пандэміі склалі $12,5 трлн, што складае каля 15 % сусветнага ВУП 2020 года. Мы да гэтага часу адчуваем наступствы таго, што адбылося, — як негатыўныя (інфляцыя, лагістычныя праблемы, бюджэтныя выклікі), так і пазітыўныя (развіццё сектара дастаўкі, дыстанцыйнай работы, сферы інфармацыйных тэхналогій).

Нарэшце, ёсць тэндэнцыі, якія ўзмацніліся з-за пандэміі, маштаб і наступствы якіх нам яшчэ трэба будзе ацаніць, перш за ўсё — гэта крызіс існуючай мадэлі глабалізацыі і ўсё большая рэгіяналізацыя сусветнай эканомікі. Пандэмія каранавіруса выступіла толькі ў ролі каталізатара змен і прымусіла нас звярнуць на іх увагу. Працэс трансфармацыі сусветнай эканамічнай сістэмы пачаўся даўно, але ён заставаўся доўгі час незаўважны для большасці радавых грамадзян нашай планеты.

Пандэмія абвастрыла існуючыя сацыяльна-эканамічныя праблемы і агаліла супярэчнасці паміж краінамі, прадэманстравала іх рэальныя магчымасці і выкрыла ўнутраныя канфлікты. Пад «дымавой заслонай» ковіду ў нашай краіне ў 2020 годзе паспрабавалі здзейсніць палітычны пераварот, разыграўшы карту незадаволенасці дзеяннямі кіраўніцтва краіны.

Беларусь пераадолела ўсе цяжкасці і нягоды, выйшаўшы з іх больш моцнай і загартаванай. Усё, пра што казаў наш лідар Аляксандр Лукашэнка, было рэалізавана і аказалася аптымальным шляхам да пераадолення хваробы і яе наступстваў, а наш шлях стаў эталонам для пераймання іншым краінам.

Жыць сваім розумам, гаварыць праўду, працаваць на карысць сваёй краіны і яе грамадзян — у гэтым сутнасць нашай палітыкі, якая рэалізоўваецца Прэзідэнтам. Беларусь — самастойная і суверэнная дзяржава, здольная прымаць рашэнні, вызначаць уласныя шляхі развіцця, абапіраючыся на нашы рэсурсы, перакананні і каштоўнасці. У нашай рэчаіснасці няма месца палітыканам, а сапраўдныя палітыкі заўсёды знаходзяць падтрымку народа.

**Мікалай БУЗІН,**
**старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў, прафесар.**

# Новы год без прыгод



**Што трэба ведаць дарослым і дзецям, каб не сапсаваць сабе і блізкім святочны настрой?**

**Падрыхтоўка да Новага года і Каляд — у самым разгары. Вуліцы і праспекты, вітрыны буйных гандлёвых цэнтраў, прадпрыемствы і ўстановы зазззялі бліскучымі гірляндамі. У розных пунктах гарадоў навагоднія ілюмінацыі, радуюць вока прыгажуні ёлкі. Людзі спяшаюцца стварыць святочны настрой і ў сябе дома: упрыгожваюць вокны бліскучымі агеньчыкамі, набываюць ёлкі, іншую навагоднюю атрыбутыку. Хтосьці ўжо думае пра навагоднюю ноч: карыстаюцца попытам у пакупнікоў феерверкі.**

Аднак у перадсвяточных клопатах варта не забыць аб самым важным — бяспецы. І ёлкі, і гірлянды, а тым больш піратэхніка могуць не толькі ўзняць настрой, але і сапсаваць яго да такой ступені, што і святу будзеш не рады. Каб гэтага не адбылося, рэкамендуем прыслухацца да парад ратавальнікаў.

## Бліскучая забойца

Якое свята без ёлкі? Гэтым пытаннем, напэўна, задаецца кожны. Лясная прыгажуня, якую ў многіх кватэрах і хатах замянілі яе штучныя аналагі, даўно стала сімвалам Новага года. Чым толькі яе не ўпрыгожваюць! Цукеркі, якія калісьці вешалі на калючых галінках, і вата — імітацыя снегу — адышлі ў нябыт. Галоўным атрыбутам упрыгожвання ёлкі ў новым стагоддзі з'яўляецца электрычная гірлянда. Ёй апошнім часам аздабляюць не толькі ёлку, але і ледзь не ўсе вокны, а то і сцены.

А, між іншым, гэта электрычны прыбор, да эксплуатацыі якога варта падыходзіць з розумам. Інакш можа паўтарыцца тое, што ў мінулагоднім снежні перажыла жыхарка аграгарадка Варняны Гродзенскай вобласці. Пакуль гаспадыня займалася хатнімі справамі, у суседнім пакоі загарэлася шторка-гірлянда. Аб здарэнні жанчыну папярэдзіў аўтаномны пажарны апавяшчальнік. Пакуль яна выклікала ратавальнікаў, у пакоі ўжо гарэлі канапа і аконная фіранка. Больш сур'ёзных наступстваў не дапусцілі супрацоўнікі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях: за лічаныя хвіліны яны ліквідавалі ўзгаранне, да якога, як потым высветлілася, прывяло кароткае замыканне святлодыёднай святочнай гірлянды.

А вось сям'і бабруйчан, у кватэры якіх на мінулы Стары Новы год таксама загарэлася гірлянда, пашанцавала менш. У ноч з 13 на 14 студзеня 55-гадовая жыхарка трохпакаёвай кватэры прачнулася ад паху гару. У пакоі, дзе спала яе 84-гадовая маці, гарэла гірлянда на ёлцы. Пенсіянерка не магла перасоўвацца самастойна. Дачка перацягнула яе ў далёкі ад агню пакой, а сама кінулася па дапамогу да суседзяў. Ратавальнікі, якія прыбылі да месца выкліку, вынеслі з задымленай пасткі пенсіянерку і яе 85-гадовага мужа, гаспадара кватэры. Мужчына атрымаў атручэнне прадуктамі гарэння, а жанчына — тэрмічныя апёкі цела. Выратаваныя былі шпіталізаваны. Шпіталізацыя спатрэбілася і іх дачцэ: пры спробе самастойна патушыць падпаленую ёлку яна таксама атрымала апёкі. 84-гадовая жанчына памерла ў бальніцы.

## Гірлянда: як выбраць і эксплуатаваць

Многія думаюць, што электрагірлянда — прыбор, які можна эксплуатаваць без нагляду, днём і ноччу пакідаючы ў сетцы. Аднак любыя гірлянды з'яўляюцца пажаранебяспечнымі. Таму, каб знізіць рызыку ўзгарання, абавязкова выключайце іх і на ноч, і пры выхадзе з дому.

«Пры набыцці гірлянды варта патрабаваць у прадаўца сертыфікат адпаведнасці, уважліва вывучыце інструкцыю, — звяртае ўвагу **намеснік начальніка цэнтра ўзаемадзеяння з грамадскасцю і СМІ Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Анастасія ШВАЙБОВІЧ.** — Важна, каб якасць і бяспека прыбора былі пацверджаны. На ўпакоўцы абавязкова павінна быць указана ўся асноўная інфармацыя аб гірляндзе на рускай або беларускай мове (назва, вытворца, фірма, даўжыня вырабу, дапушчальныя магутнасць і напружанне, прызначэнне — што гірлянду можна выкарыстоўваць для ўпрыгожвання ёлкі)».



Перад першай эксплуатацыяй ратавальнікі рэкамендуюць праверыць работу ўсіх рэжымаў гірлянды, надзейнасць гнёздаў, ізаляцыю правадоў, злучэнне з блокам кіравання. Калі гірлянда, якая ўжо была ў вас у выкарыстанні, выклікае сумненні — няма лямпачкі, ёсць пашкоджанні, агаленыя правады, самаробныя злучэнні, — лепш яе не выкарыстоўваць. Як паказвае практыка, пажары часцей за ўсё ўзнікаюць з-за праблем са старымі або самаробнымі гірляндамі. Таму, перад тым як павесіць яе на ёлку або акно, варта паклапаціцца аб спраўнасці сваіх «агеньчыкаў».

## Ёлка: дзе паставіць і чым упрыгожыць

На бяспеку эксплуатацыі ўпрыгажэння ўплывае нават тое, наколькі надзейна замацавана ёлка: калі яна пачне падаць і нацягне провад, можа адбыцца замыканне. Таму ёлку трэба абавязкова замацаваць на ўстойлівай падстаўцы. Дываны і дывановыя пакрыцці з-пад ёлкі лепш прыбраць. Шукаючы месца для зялёнай прыгажуні, у першую чаргу варта задумацца аб тым, дзе гэта будзе бяспечна: ёлку трэба ставіць падалей ад ацяпляльных прыбораў, тэлевізара, батарэй.

Нельга ўпрыгожваць ёлку цацкамі, якія лёгка запальваюцца, самаробнымі электрагірляндамі, абкладваць падстаўку пад ёлкай ватай, упрыгожваць падпаленымі свечкамі. Гэтыя правілы адносяцца як да сапраўдных, так і да штучных ёлак. Не рэкамендуецца размяшчаць ёлку каля прыбораў ацяплення, батарэй, электрычных абагравальнікаў. Штучныя ялінкі ўспыхваюць вельмі хутка, таму справіцца з пажарам будзе няпроста.

Штучную ёлку трэба купляць у спецыялізаваным магазіне. Не лянуйцеся спытаць сертыфікат бяспекі. Што датычыцца лясной прыгажуні, яна павінна мець свежую зялёную ігліцу, а яе ствол павінен быць смаляністы і ліпкім навобмацак. Даўно ссечаная і засохлая ёлка надзвычай пажаранебяспечная.

«Калі ж узгарання пазбегнуць не ўдалося, у першую чаргу выцягніце гірлянду з электрасеткі, — рэкамендуе Анастасія Швайбовіч. — Затым перакуліце ёлку на падлогу і накрыйце яе шчыльнай коўдрай, пледам або дываном. У гэтым выпадку можа спатрэбіцца парашковы вогнетушыцель, калі такі ёсць у наяўнасці. Калі самастойна справіцца з пажарам не атрымалася, патэлефануйце па нумарах 101 або 112, пакіньце памяшканне і зачыніце ў ім дзверы».

## Піратэхніка: што набываць і як эксплуатаваць

Ні адзін Новы год не абыходзіцца без запуску феерверкаў. Піратэхніка стала даступнай, але да яе выбару таксама варта ставіцца адказна. Падчас набыцця салютаў неабходна звяртацца да сертыфікаванай прадукцыі. Як і ў выпадку з гірляндай, перад запускам феерверку прачытайце інструкцыю, каб быць гатовым да любой сітуацыі, якая можа адбыцца. Сертыфікаваная прадукцыя дае ўпэўненасць у тым, што яна правільна захоўвалася, прайшла праверку.

«Набываючы піратэхніку нават у краме, звяртайце ўвагу на наступныя моманты: наяўнасць інструкцыі, якая павінна быць напісана на рускай (беларускай) мове, пры гэтым тэкст павінен быць цалкам выразным і не мець размытых і незразумелых частак, — заўважае намеснік начальніка цэнтра ўзаемадзеяння з грамадскасцю і СМІ МНС. — Упакоўка не павінна мець увагнутасцяў і якіх-небудзь дэфектаў. Правярайце тэрмін прыдатнасці прадукцыі, наяўнасць дакументаў, якія пацвярджаюць адпаведнасць патрабаванням бяспекі».

Неабходна не проста азнаёміцца з інструкцыяй, выконваць усе выкладзеныя ў ёй патрабаванні. Жарты і розыгрышы з выкарыстаннем піратэхнікі могуць прывесці да трагічных наступстваў. Каб гэтага не здарылася, пры выкарыстанні піратэхнікі неабходна выконваць наступныя правілы бяспекі, якія дастаткова простыя і якія лёгка запомніць.

Па-першае, не адкрывайце ўпакоўку і не выкарыстоўвайце піратэхнічныя вырабы ў памяшканні (у кватэры, на балконе, у пад'ездзе). Па-другое, не насіце падобны тавар у кішэні, тым больш не кладзіце яго ва ўнутраную кішэню верхняга адзення. Па-трэцяе, перад запускам звярніце ўвагу на кнот — ён павінен быць дастаткова доўгім, каб была магчымасць адысці на бяспечную адлегласць. Па-чацвёртае, для запуску выкарыстоўвайце адкрытую пляцоўку ўдалечыні ад вялікай колькасці людзей і будынкаў (збудаванняў). Па-пятае, запускаць піратэхніку можа толькі дарослы паўналетні чалавек, не варта давяраць запуск салюту дзецям або людзям, якія знаходзяцца ў нецвярозым стане.

Ратавальнікі папярэджваюць: калі феерверк не запусціўся, не спяшайцеся высвятляць, чаму так атрымалася. Варта пачакаць некалькі хвілін, а затым асцярожна падысці, заліць выраб, які не спрацаваў, вадой і выкінуць. Кнот, які ўжо прагарэў, нельга запальваць ізноў. Пасля таго як салют адпрацаваў, падыходзіць да яго можна не раней, чым праз дзве-тры хвіліны.

І, самае галоўнае, дарослыя абавязкова павінны патлумачыць дзецям, да чаго можа прывесці самастойны запуск піратэхнікі. Нярэдка цана такога вопыту вельмі вялікая: можна застацца і без пальца, і без вока... Урачы, якія дзяжураць у перадсвяточныя дні і ў навагоднюю ноч, ведаюць нямала гісторый пра людзей, якія пацярпелі ад піратэхнікі. І гісторыі гэтыя, паверце, зусім не вясёлыя...

* * *

Навагоднія святы — не нагода расслабляцца. Адпачыць, вядома, трэба і нават неабходна. Аднак пра элементарныя правілы бяспекі забывацца нельга ні на хвіліну. У месцах масавага знаходжання людзей аб іх абавязкова нагадаюць ратавальнікі, якія будуць пастаянна там знаходзіцца. А вось у сваёй хаце за ўласную бяспеку, а таксама здароўе і жыццё сваіх родных і блізкіх адказны кожны з нас. Галоўнае — за ўсёй святочнай мітуснёй не забыцца пра гэта.

